АЛЯКСАНДР СМОЛІК

# БІБЛІЯТЭКА ва ўмовах сацыяльна-культурнай трансфармацыі грамадства



Аналіз гістарычнага развіцця ўстаноў культуры сведчыць: глабальныя сацыяльныя змены непазбежна фарміруюць дзейнасць і інстытуцыянальную ўстойлівую пазіцыю любога сацыяльнага інстытута, што адбіваецца на яго функцыяніраванні. Безумоўна, крызісная сітуацыя, якая пачала складвацца ў Беларусі з канца 80-ых гг. і абвастрылася пасля чарнобыльскай тэхнагеннай катастрофы, істотна паўплывала на сацыяльны прэстыж бібліятэчнай дзейнасці. Вывучэнне стану бібліятэчнай справы, якая склалася ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст., паказвае, што ў гэтай галіне культуры назіраецца павелічэнне разрыву паміж бібліятэкай і грамадствам у цэлым і паміж бібліятэкай і асобай у прыватнасці. Працэсы мадэрнізацыі грамадства спалучаюцца са зменай сацыяльнага ўладкавання і эканамічным крызісам, што значна ўскладняе становішча бібліятэк. Даследаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, фондаў бібліятэк Беларусі сведчыць: для бібліятэк звыклымі сталі пастаянны недахоп сродкаў для ажыццяўлення бягучай работы, цяжкасці тэхнічнага пераабсталявання, праблемы падрыхтоўкі кадраў, адэкватных сучаснай сітуацыі.

Аналізуючы дзейнасць бібліятэк за апошнія 10 гадоў, трэба адзначыць, што гэта быў вельмі складаны перыяд. Глыбокі эканамічны крызіс і сацыяльна-эканамічныя наступствы аварыі на ЧАЭС выклікалі скарачэнне фінансавання бібліятэк.

Асаблівую трывогу выклікае інтэнсіўнае скарачэнне бібліятэчнай сеткі ў сельскай мясцовасці. Гэты працэс пачаўся некалькі раней, але тады ён быў выкліканы аб'ектыўнай прычынай — змяншэннем колькасці сельскага насельніцтва. Толькі за 1990—1995 гг. у сельскай мясцовасці было зачынена 677 бібліятэк. Калі ўлічыць, што кожная з іх абслугоўвала не адзін, а некалькі невялікіх населеных пунктаў, то атрымліваецца, што жыхары прыкладна 1800 вёсак пазбавіліся магчымасці карыстацца бібліятэчнымі фондамі і страцілі, па сутнасці, адзіную ўстанову, дзе маглі з карысцю для сябе правесці вольны час і далучыцца да духоўных каштоўнасцей.

Не здолелі публічныя бібліятэкі захаваць у ранейшым выглядзе і сваю нестацыянарную сетку. Калі ў 1993 г. бібліятэчныя пункты працавалі пры 2167 бібліятэках, то ў 1995 г. — толькі пры 1640.[1] І зноў жа гэта закранула, у першую чаргу, сельскую мясцовасць, дзе з іх дапамогай абслугоўваліся маланаселеныя і аддаленыя ад стацыянарных бібліятэк вёскі. Закрыццё бібліятэк і бібліятэчных пунктаў стала першапрычынай скарачэння колькасці чытачоў у сельскай мясцовасці.

Асабліва інтэнсіўна адбывалася змяншэнне колькасці бібліятэк у раёнах, якія пацярпелі ад экалагічнай катастрофы. Пасля Чарнобыльскай аварыі і адсялення было страчана шмат аб'ектаў культуры. Толькі ў Гомельскай вобласці з 1986 па 1991 гг. было страчана 111 бібліятэк.[2] Пра тэмпы скарачэння сеткі бібліятэк сведчаць ніжэйпрыведзеныя табліца і дыяграма.

Такім чынам, даныя табліцы сведчаць: з 1987 па 1997 г. у Рэспубліцы Беларусь адбылося скарачэнне бібліятэчнай сеткі на 1046 бібліятэк. Зменшылася колькасць чытачоў на 247,8 тыс. чалавек, аб'ём фонду скараціўся на 17 805,4 тыс. кніг, часопісаў і брашур. У Гомельскай вобласці колькасць бібліятэк зменшылася на 157 адзінак, у Магілёўскай вобласці — на 152. Бібліятэчныя фонды Гомельскай вобласці скараціліся на 2287,1 тыс., колькасць чытачоў — на 228,2 тыс. чалавек. Аналагічны працэс адбываўся і ў Магілёўскай вобласці, дзе фонд за гэты час скараціўся на 3036,8 тыс. экз., колькасць чытачоў — на 215,8 тыс. чалавек.[4]

З дыяграмы відаць, што дзяржаўныя бібліятэкі перажывалі вялікія цяжкасці пры фарміраванні фондаў. Гэта было выклікана скарачэннем фінансавання, ростам кошту друкаваных выданняў, негатыўнымі тэндэнцыямі ў выдавецкай палітыцы. Не атрымлівалі абавязковага рэспубліканскага экземпляра абласныя бібліятэкі. У асабліва складаным становішчы апынуліся цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы.

У асобныя гады рэпертуар паступленняў у адну бібліятэку ў сярэднім не перавышаў 15 назваў. Гэта значыць, што да многіх сельскіх бібліятэк новыя кнігі амаль не даходзілі, у лепшым выпадку паступала ўсяго 5 — 6 экз. за год.

Часта нават тыя мізэрныя сродкі, якія выдзяляліся на камплектаванне, паступалі ў бібліятэкі нерэгулярна. У выніку некаторыя з іх атрымлівалі магчымасць папаўняць фонды ўсяго 1 — 2 разы ў год і станавіліся даўжнікамі бібкалектараў. Амаль страцілі масавыя бібліятэкі магчымасць падпісвацца на расійскія перыядычныя выданні. Большасць сельскіх бібліятэк атрымлівала па дзве назвы рэспубліканскіх газет і тры назвы часопісаў.

Інтэнсіўна шукалі бібліятэкі дадатковыя сродкі. У цэлым толькі за

*Табліца 1.* **Колькасць бібліятэк, чытачоў і аб'ём бібліятэчнага фонду (у тыс.)[3]**

| Назва | Гады | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1987 | 1990 | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 |
| Бібліятэкі | 5,824 | 5,546 | 5,371 | 5,523 | 5,152 | 4,975 | 4,882 | 4,800 | 4,778 |
| Чытачы | 4302,8 | 3 996,0 | 3981,3 | 3984,6 | 4009,3 | 3993,6 | 3970,6 | 3992 | 4055 |
| Фонд | 89755,4 | 8642,3 | 8187,4 | 77210,1 | 76010,6 | 74609 | 73504,4 | 72286 | 71950 |

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

*Дыяграма 1.* **Колькасць дзяржаўных публічных бібліятэк у 1987 — 1997 гг.**




1995 г. дзяржаўныя бібліятэкі ў дадатак да паступленняў з бюджэту атрымалі ад платных паслуг насельніцтву 531 млн. руб., ад здачы ў арэнду плошчаў — 1007 млн., ад узносаў і ахвяраванняў — 78 млн. руб. Іншыя паступленні склалі 241 млн. руб.[5]

За апошнія гады бібліятэкі сталі больш рацыянальна выкарыстоўваць назапашаныя раней кніжныя багацці і станоўчы вопыт, улічваючы рэальныя патрэбы чытачоў.

Міністэрства культуры, мясцовыя органы ўлады, грамадскасць вырашалі пытанні жыццяздольнасці бібліятэк, выпрацоўвалі мадэлі і сцэнарыі іх далейшага развіцця. У якасці перспектыўнага накірунку развіцця бібліятэкі прапаноўвалася інтэграцыя яе з іншымі сацыякультурнымі ўстановамі.

На працягу 1992—1995 гг. праводзіўся эксперымент па аб'яднанні сельскіх і школьных бібліятэк у 31 населеным пункце 6 раёнаў Брэсцкай (Івянецкі і Бараноўіцкі), Магілёўскай (Горацкі) і Мінскай (Барысаўскі, Салігорскі, Слуцкі) абласцей.

Дынамічнасць працэсаў інфарматызацыі, іх выразная мадэрнізуючая накіраванасць патрабавалі ад бібліятэк вырашэння праблемы інфарматызацыі бібліятэчнай справы. За 90-ыя гг. некаторыя бібліятэкі правялі пэўны аб'ём работы па камп'ютэрызацыі сваёй сістэмы. На 1998 г. на 90% была аўтаматызавана Нацыянальная бібліятэка Беларусі, у абласных бібліятэках узровень аўтаматызацыі дасягнуў 50%, у раённых і гарадскіх цэнтральных бібліятэчных сістэмах былі аўтаматызаваны толькі працэсы камплектавання і апрацоўкі літаратуры.[6]

З улікам змянення сацыяльнай прасторы бібліятэкі адбывалася ўдакладненне яе статусу, функцый, мэты, задач і формаў дзейнасці. Акрамя інфармацыйнай функцыі бібліятэка як сацыякультурны інстытут арыентавалася таксама на дзейнасць па падтрымцы культурных традыцый у грамадстве, па адаптацыі чалавека да розных сацыяльных сітуацый.

Многія бібліятэкі сталі сапраўднымі культурнымі цэнтрамі ў сваіх населеных пунктах, куды людзі прыходзяць не толькі ўзяць неабходную кнігу, але і сустрэцца з цікавымі людзьмі, творчай інтэлігенцыяй, убачыць творы мастакоў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

*ЗАЎВАГІ*

*[1] Культурнае жыццё Рэспублікі. Стан, праблемы, тэндэнцыі. Статыстычны агляд тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 1995 год.— Мн.,1996.— С.65.*

*[2] Набат.— 1991.— №21.— С.6.*

*[3] Табліца і дыяграма пабудаваны на аснове афіцыйных статыстычных даных Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якія маюцца ў статыстычных аглядах тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы Міністэрства культуры за 1987—1997 гг.*

*[4] Падлічана на аснове аналізу статыстычных матэрыялаў, якія маюцца ў даведніках "Культурнае жыццё Рэспублікі. Стан, праблемы, тэндэнцыі" за 1987 — 1997 гг.*

*[5] Культурнае жыццё Рэспублікі. Стан, праблемы, традыцыі...— Мн.,1996.— С.62.*

*[6] Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфармацыйны зборнік /Нац. б-ка Беларусі.— Мн.,1998.— С.42.*

Summary

The activity of libraries of Belarus in conditions of social and cultural transformation of a society is considered in the article.

## У ДАПАМОГУ СІСТЭМАТЫЗАТАРАМ

За апошнія гады выдана шмат літаратуры аб катастрофах, сенсацыях, загадкавых з'явах. На практыцы пры індэксацыі такіх кніг узнікаюць пэўныя цяжкасці, выкліканыя іх шматаспектнасцю. У гэтыя выпадках неабходна прытрымлівацца тых індэксаў ББК, якія найбольш дакладна раскрываюць змест кніг. Напрыклад, кніга Лі Дэвіса "Природные катастрофы" (т. 1; Смоленск, 1997), выдадзеная ў серыі "Энциклопедия обо всем", мае індэкс 63.3(О)я2. Паколькі ў гэтым выданні аўтар разглядае выпадкі прыродных катастроф і стыхійных бедстваў дакладней будзе выкарыстаць індэкс 26.2я2. Кніга Лі Дэвіса "Природные катастрофы" (т. 2; Смоленск, 1997), у якой аўтар разглядае акрамя прыродных катастроф выпадкі эпідэмій, атрымае індэкс 26.2я2+51.9я2.

На кнізе "Канувшие в бездну" (М., 1997) серыі "Неведомое, необъяснимое, невероятное", прысвечанай тайнам гібелі суднаў і іх пасажыраў, спробам раскрыць прычыны гэтых трагедый, прастаўлены індэкс 84-4, які не адпавядае яе зместу. Дакладным будзе 39.42-08.

Дапушчаны недакладнасці і пры індэксацыі зборнікаў "Загадки авиакатастроф" (Мн., 1998), "Катастрофы и аварии" (Мн., 1966), якія выйшлі ў свет у выдавецтве "Літаратура". На наш погляд, індэкс першай кнігі згодна зместу павінен быць 39.52-08я2. Другому выданню мы прапануем індэкс 26.2я2+39.1-08я2.

Існуюць праблемы пры індэксаванні кніг амерыканскага антраполага Карласа Кастанеды. Тэма яго твораў — "незвычайная рэальнасць", незвычайныя станы чалавечай псіхікі, светаразуменне, непазнавальны свет магіі. Так, зборнік "Учение дона Хуана" (С-Пб, 1993) уключае творы Карласа Кастанеды, у якіх ён апісвае асабісты вопыт і уласныя перажыванні, звязаныя з уваходам у стан "незвычайнай рэальнасці". Гэта выданне павінна мець індэкс 86.41+88.6.

Кніга К.Кастанеды "Искусство сновидения" (Киев, 1993), у якой даследуецца псіхалогія сноў, таксама будзе мець індэкс 86.41+88.6.

*Аддзел бібліятэказнаўства НББ*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ